**Сяргей Законнікаў**

# Святая воля

*Выбраная лірыка*

Мінск
«Мастацкая літаратура»
1993

Серыя заснавана ў 1967 г.
Рэдакцыйная калегія:
*Рыгор Барадулін, Ніл Гілевіч, Максім Лужанін,
Пімен Панчанка, Максім Танк*

Лауреат Литературной премии имени Аркадия Кулешова (1982) Сергей Законников, который так много делает для нашего духовного национального возрождения, своими первыми выступлениями в печати (1963) засвидетельствовал свой неподдельный гражданский пафос, свою искреннюю любовь к родной земле.

В эту книгу вошло лучшее из его книг «Беседа», «Встань раньше солнца», «Пока живет моя береза», «Вера, надежда, любовь» и др.

ISBN 5-340-01062-7 © Законнікаў С. І., 1993

**СВЯТАЯ ВОЛЯ**

*На дарозе між спелых калін*
*Папрасілася сэрца на волю...*
*Быць таму.*
*Дам хоць колькі хвілін*
*Вызвалення ад рабскае долі.*
*Хай яно,*
*нібы конь,*
*адпачне*
*Ад аброці і цугляў апрыклых.*
*Адпушчу,*
*хоць і збэсцяць мяне*
*За такі неабачлівы прыклад.*

*Свішча вецер у грыве густой,*
*Капыты б'юць у бубен абшару.*
*Над скапычанай пыльнай вярстой*
*Растаюць і надзеі,*
*і мары.*

*А калі конь паверне дамоў,*
*Хоць і з жалем,*
*але забрытаю.*
*Каб ніхто не пачуў нашых змоў,*
*Паціхеньку на вуха спытаю:*
*«Дзе ты,*

*косю мой верны,*
*блукаў,*
*Што любіў апантана,*
*найболей,*
*Што ў агромністым свеце шукаў?» —*
*Толькі волю,*
*адзіную волю!*
*1987*

* * *

Зямля мая,
ты для мяне — як дзіва,
Як першы дотык любае рукі,
Як у спякоту млосную ільдзінка,
Як на кашулі белай васількі.
Мне б толькі быць з табой —
ну, хоць бы верасам,
Расінкай,
што пад промнямі дрымсыць.
Ты пражывеш і без мяне,
я ведаю,
А мне ніколі без цябе не жыць.
*1964*

**У БРЭСЦКАЙ КРЭПАСЦІ**

Як соты пчаліныя,
свецяцца сцены,
Дзе кожнай цагліне хапіла свінца,
Блукаюць па форце маўклівыя цені
Салдат,
што стаялі насмерць,
да канца.
Прабачце мне,
хлопцы,
што ў час навальніцы,
У самы суровы,
бязлітасны час,
Калі палыхалі агнямі байніцы,
Я ў форме вайсковай не быў сярод вас...
Гляджу,
як праз пекла,
дзе ўсё косіць згуба,
Не ўдаўся байцу ратавальны рывок.
Сцякае крывёю юнак светлачубы,
Сцякае вадою жывой кацялок.
Хачу дапаўзці
тою сцежкаю вузкай
Да вас і хоць неніта,
хоць штосьці зрабіць:
Паднесці надзею да спечаных вуснаў,
Балючыя раны абмыць, загаіць.
Прабачце мне,
хлопцы...
Ісці мне няблізка
Дарогай любові,
дарогай віны...
У вочы глядзяць з вышыні абеліскаў
Салдаты апошняй...
Апошняй вайны?..

*1964*

* * *

Сякуць жанчыны ў гародах капусту,
За імі паўзе непрыкметна вечар.
Ляцяць качаны ў барозны з хрустам,
Стаяць качарыжкі, нібыта свечкі.

Узмах за ўзмахам і крок за крокам,
Трашчыць пад нажамі калянае лісце…
Жартуюць, што тут —
у царстве крохкім —
Кожнага з нас адшукалі калісьці.

Ляжаў я ў разоры, на рукі хукаў,
Чуў холад калючы сніною голай,
Ды хтосьці ў ватоўку мяне захутаў,
Пачуўся матулі ласкавы голас.

Вялікую і невыказную радасць
Жыццё назаўсёды тады прыслала.
Зіма засцілала абрусамі грады,
А сэрца малое маё снявала.
…Сняжынак соль на зямлю, як на лусту,
Рукою шчодрай сынле мяцсліца.
Сякуць жанчыны ў гародах капусту,
Качаннем марозным рыпіць аселіца.
1965

## РАЗМОВА З ЦЁЗКАМ

Тут пахаваны сяржант Сяргей. 1941 год.
*Надпіс на помніку*

Гляджу, як рэактыўны цягне сцежку,
І сцежка тая ад зары ў крыві…
А ціішыні няма. Яе няснешна
Раззвоньваюць лясныя салаўі.
Сяргей, ты іх і зараз нават чуеш,
Як і тады над выбухамі мін.
Твой абеліск нлыве антэнай чуйнай
Над звонам траў і шолахам асін.
Ён ловіць галасы, вятроў дыханнс,
Далёкае ад выбухаў вайны.
Ды на змярканні гукі аціхаюць,
Каб не трывожыць добрым людзям сны.
Але з нябыту твой прыходзіць голас —
За тымі нраўда, што ў баях ляглі.
Цянер ты, можа, кронля. Можа, колас.
Ды ўсё ж жывеш са мною на зямлі.
Г о л а с з з я м л і:
Чаму не бачу твар твой, цёзка?
Чаму толькі чую голас?
Чаму так цяжка мне дыхаць?
Чаму тут няма світанняў,
А толькі ноч адна?

Ты ў сорак першым паў.
Я нарадзіўся ў сорак шостым.
І вось мы побач на паляне у бары.
Ты быў, а я нядаўна стаў дарослым,
Давай жа па-мужчынску гаварыць.
Грымела, заплывала дымам далеч,
А людзі, завяршаючы палёт,
У акіяне лёсу адпадалі
Ступенямі касмічных караблёў.
На абеліску — твой апошні ордэн,
Тут для цябе цяпер
і фронт,
і тыл...
А мне ў жыцці стаяць патрэбна цвёрда,
Бо мой пачатак і аснова — ты.
Голас з зямлі:
Не прасіце, жывыя,
у нас прабачэння.
Лёсу нашаму не зайздросце,
але не кляніце.
Лепш скажыце,
як там мама мая жыве?

Гады вайны, як вырай, адляцелі,
Але журбу на крылы не ўзялі,
А я ў вачах матуль асірацелых
І за цябе ўзяў варту на зямлі.
Падобны на сыноў, жывы, здаровы,
Іду па свеце — памяці ганец.
І хусткі ападаюць аж на бровы,
І позіркі сыходзяцца на мне.
Голас з зямлі:
Сястрычка родная...
Маленькі абдзіманчык...
Таня...
Ратуй яе! Танкі...
Танкі...
Танкі...
Ты бачыш, цёзка, іх,
Ты бачыш іх?
О, не, Сяргей, то жаўранак спявае,
Нібы званочак цягнецца ўгару...
Цябе жыццё ўва мне не пахавае...
Дастань кісет — махоркі закуру.
Прабач,
Мне трэба думаць, доўга думаць.
*1966*

## ГУСЛІ

Замешаны роднын гукі густа,
Крыштальнай расою зіхцяць, звіняць.
Гудуць над Белай Руссю гуслі,
І песні-лебедзі ляцяць…
«Запражыце коніка мне найлепшага,
Запражыце мне сіўца-варанца.
Сяду я, паеду да свайго дварца.
Еду я лесам — лес мой не шуміць,
Еду я полем — поле не звініць,
Еду я мостам — мост мой не гручыць».
Пакуль будуць гуслі звінець
На Нёмне сінім, на чыстай Дзвіне,—
Руні нашай вясной зелянець,
Дочкам нашым жаніхоў мець,
Хлебу духмянаму быць на стале,
Роднаму слову з намі сталець.
*1967*

## ЖЫВУ НА ЗЯМЛІ

У празрыстым спляценні
Сонца,
траў,
каласоў
Продкаў ясныя цені,
Рэха іх галасоў.
Не ўвярэдаю стома.
Вабіць новы прастор...
Незвычайна, знаёма
Ветрам дыхае бор.
Ціхі голас аклікнуў,
Абступілі камлі...
Я ніяк не прывыкну,
Што жыву на зямлі.
*1968*

## ПРЫХОДЗЬЦЕ ДА МЯНЕ

Я — лістапад. Прыходзьце да мяне
Па той сцяжыне, дзе вятры блукаюць.
Прыходзьце. Шчасце тых не абміне,
Хто тут мяне,
у лесе,
адшукае.
Прыходзь,
дзяўчына,
з ціхага сяла,
Пастой пад вадаспадам жаўталісця.
Ты станеш прыгажэйшай, чым была,
І добрым словам памянеш калісьці.
Прыходзь,
матуля любая,
сюды,
Табе я ў хустку восені насыплю.
І ты пачуеш голас малады
Забітага пад Беластокам сына.
Прыходзь і ты,
дзядуля,
сёння ў бор
Пагрэцца ля кастроў, што вецер носіць.
Гарачы ліст вазьмі яшчэ з сабой —
Жыцця твайго спакойнай будзе восень.
Я — лістапад. Я — добры чараўнік.
Усе нягоды лісцямі лячу я.
Прыходзьце, людзі, покуль я не знік,
Прыходзьце ўсе, хто боль ці сум адчуе.
*1968*

## ЦІШЫНЯ

Не грымяць салаўіныя гімны...
А было, што нічым не суняць.
У жалобе ля брацкай магілы,
Нібы маці,
стаіць цішыня.
На світанні,
у поўдзень
і ўночы
Сняць салдаты...
Заснулі даўно...
Васількоў вечна сумныя вочы —
У нябыт іх трывожны
акно.
*1969*

* * *

Дзесьці вучоныя расшчапляюць атам,
Пра лёсы людзей дыпламаты спрачаюцца.
А ў Глыбачцы дзядзька шалюе хату
І калыска ў садзе гайдаецца.

Дзесьці натужна равуць бамбавозы,
Зямля ад напалму плавіцца.
А ў Глыбачцы двое ў лодцы на возеры
Лілеі перабіраюць пальцамі.

Дзесьці статыстыкі дакладна падлічваюць,
Колькі бязвінных штодзень забіваюць.
А ў Глыбачцы стары дзед над ліпай
Унукам пра шэрага воўка баіць.
*1970*

## ВЫСПЕЛАЕ ПОЛЕ

Воблакаў пушыстых парашуты
На зямлю садзяцца за сялом.
Сонца на заходзе расчыркнута
Ластаўчыным тоненькім крылом.

Пахне хлебам выспелае поле.
Наплывае цемень ад лясоў.
І зара задумліва ў прыполе
Выбірае промні з каласоў.
1970

## ПЕРШААДКРЫЦЦЁ

Пагаслі зоркі. Над зямлёй світае.
Ад цішыні хмялее галава.
За лесам коні ходзяць па атаве,
Хрумсціць ледзь чутна росная трава.
Прайдзі праз бор па леташняй ігліцы,
І ўбачыш,— толькі ціхенька пастой,
Як жарабя цікаўнае ў крыніцы
На месяц наступае капытом.
*1970*

## АЛЁНКА

А яна смяецца без прычыны,
Як вада ў вясновым раўчуку...
Я нясу маленькую дзяўчынку,
Я нясу суседчыну дачку.

Асцярожна крочу, каб не ўпасці.
І плыве сцяжынка да ракі...
Не маё,
        але такое шчасце
Туліцца ласкава да шчакі.
*1970*

## КУЛЯ
*Балада*

Калгасам ладзілі ёй хату —
Героя маці і ўдаве.
На шчасце лёс не быў багаты,
А тут адчула, што жыве.
Дом як званочак зграбны, новы
Вачамі шыб не свет глядзеў.
Жытло струхлелае — на дровы,
Нашто палохаць ім людзей?
І талака, нібы мурашнік,
Вянцы параскідала ўміг.
Старое пілаваць няцяжка,
Ды раптам скрыгат...
                Гоман сціх.
Глядзела на пілу трывожна,
Стаў твар бялей ад палатна,
Калі мужчыны асцярожна
Вымалі кулю з бервяна.
Дзень абярнуўся цёмнай ноччу,
Зноў нібы ў пекле пабыла.
- Ён ля сцяны стаяў... Сыночак!
Яна тады цябе звяла...
Кавалак сплюшчаны металу
Ператрымала паўсяла.
А бабка ўсё ў людзей пытала:
І як я побач з ёй жыла? *1972*

## КУПАЮ ДАЧКУ

Я шчаслівейшай справы, чым такая,
Не мог прысніць і ў сне сваім найлепшым —
Дачку купаю, а яна рукамі
З высокай белай пены нешта лепіць.

Любоў і радасць дораць свету вочы,
Блакіт у іх цвіце, мігціць цяпельцам.
Пад даланёй, нібы нацёрта воскам,
Пяшчотнае яе спявае цельца.

Малая узнялася на каленькі,
Вымаю цёплую яе з глыбокіх ночваў...
Тчэ завіруха шлюбныя сукенкі
Для маладзенькіх яблынь цёмнай ноччу.
*1972*

***

Абуджан лес сабачым брэхам,
Кулём ад елкі да сасны
За беляком імчыцца рэха
І б'е у вушы, як званы.

І можа б, я — пагоні сведка —
Зайчыных не заўважыў слёз,
Калі б не помніў, што нярэдка
Быў і ў людзей падобны лёс.
*1972*

## ПАМЯЦЬ

*Васілю Быкаву*

Над зямлёй гарацъ вясёлкі мая,
Чуцен зумкат сонечных чмялёў...
Толькі памяць і любоў зямная
Не знялі і сёння шынялёў.

Недзе спее навальніцай здрада,
Смерць сваіх трымаецца слядоў.
Памяць чалавечая снарадам
Разбівае ўшчэнт накат гадоў.

Шлях яе і ў заўтра скіраваны
Напярэймы подласці, бядзе...
Лейтэнант, у стэпе пахаваны,
У атаку зноў узвод вядзе.

У яго адна ёсць мерка праўды,
І сумленнс аддае загад —
З дзён былых наводзіць пераправу
І трымацца ні на крок назад!

І з душы, і з баявога слова
Уцякае здрадлівы спакой.
Сэрца у грудзях напагатове,
Як граната з вырванай чакой. *1973*

## РОЗДУМ

*Уладзіміру Караткевічу*

Гісторыю зямлі маёй цярплівай
Падручнікам вучнёўскім не ахопіш.
Гляджу на Белай Вежы ўзлёт імклівы,
На каску, што ржавее у акопе.

Гады сівыя сцелюцца туманам,
Нядаўнія — гараць зарой трывожнай.
Я крочу па мясцінах неўзараных,
Нібы па тонкім лёдзе, асцярожна.

У даўніну іду, як у разведку,—
Там звон мячоў, там водбліск зараніцы.
На ўсім шляху стаяць нямыя сведкі —
Валы, муры, траншэі і байніцы...

Радкі былога ткаліся паволі,
Свяціла цьмяна летапісцам поўня...
Шануй здабытую ў змаганнях волю
Цябе і праз вякі нашчдкі ўспомняць.
*1973*

**ХЛЕБ**

*Рыгору Барадуліну*

Нібыта ў жыце перапёлка,
Устрапянулася душа.
П'ю хлебны пах. Ён лепш за зёлкі,
Лепш сырадою з гладыша.

Ля печы маці б'е паклоны,
І кожны з іх як адкрыццё:
На залатых далонях клёна
Ляжаць не боханы — жыццё.

І так захочацца — аж слінкі —
Акрайчык адламаць цішком
Ад той пахучае скарынкі,
Што млее там, пад ручніком.

Як светла стала ў пашай хаце,
Аж вокны зіхацяць яе.
У сенцы хлеб выносіць маці —
Яму пашану аддае...

Закінутыя на гарышча,
Пыляцца клепкі ад дзяжы.
І мы па праву ганарымся,
Што ў вёсцы ў краме хлеб ляжыць.

А памяць пільная вартуе
Хвіліну тую праз гады,—
Як рэжа, стоячы, матуля
На лусты бохан малады.
*1973*

## ТАБЕ АДНОЙ

Табе адной я нёс пяшчоту,
Ды па дарозе разгубляў
Сярод снягоў, слаты, спякоты,
Сярод сяброў, пустых забаў.

Прыйшоў я нетаптанай сцежкай
І стаў, як месяц, пры акне,
А ты з даверлівай усмешкай
Глядзела моўчкі на мяне.

Без ушчуванняў і папрокаў
Руку малую падала,
І я пайшоў няспешным крокам
На водбліскі твайго святла.

І слова, што ў душы звінела,
Цвіло чаромхавай вясной,
Было таксама зразумела
Табе адной, табе адной.
*1973*

* * *

Дзень крыло распасцёр
Вольна,
            шырака,
                        смела.
Над вачамі азёр —
Бровы воблакаў белых.

Слаўна як на зямлі!
Ды над колкаю пожняй
Кружыць вогненны ліст
Мо апошняя пошта?

Чалавеку глядзець,
І любіць,
            і здзіўляцца.
Толькі нітцы надзей
Прыйдзе час абарвацца.

І святлець галаве,
Бо і горка,
               і ўсцешна...
Ля абрыву плыве
Верасовая сцежка.
*1973*

## ВЕЧНАЯ РАДНЯ

Як поле, у людзей душа адкрыта,
Пасей дабра зярняты ў глебу ты —
Дабра саспее колас залаты.
І у маіх грудзях шапоча жыта
Аб нечым светлым, родным і святым.

У жыта з небыццём няма агулу.
Будзь бласлаўлёнай прадзеда сяўня,
Што падарыла мне пачатак дня,
Прынесла песню, накарміла і абула...
Жыццё і жыта — вечная радня.
*1974*

## ДУША ЛЕСУ

Як дрэва, рос я разам з лесам
І сёння там — жаданы госць.
Я зразумеў яшчэ з маленства:
Як у людзей, душа ў ім ёсць.

Калі не так, нашто б глухому
Да нашых клопатаў і бед,
Яму, не ведаючы стомы,
Ісці ўвесь час за намі ўслед?

Жаўцеюць смольныя бярвенні,
Хоць зруб пакуль, а не жытло,
У ім суцішся на імгненне —
Аслепіць звонкае святло.

Лес аддае для кожнай хаты
Кавалачак душы святой.
Ці не таму яны багаты
Гасціннасцю і дабратой?

Вайною хрышчан не адною
І намі крыўджаны но раз,
Стаіць мой лес густой сцяною
Устойлінасці вучыць нас.

Галіны расхіну, як дзверы,
І моўчкі пастаю спярша...
А нехта ўсё яшчэ не верыць,
Што і у лесу ёсць душа.
*1974*

* * *

Увагай шчырай, пацалункамі
Не надакучыш любай —
І вочы адтаюць, як лункі,
І сонечна смяюцца губы.

Уся яна, як сад маёвы,
Зноў поўніцца святлом пяшчоты...
Шкада, што казачныя словы
Мы хочам зберагчы на потым.
*1974*

* * *

Сонца над мядовымі пракосамі
Стомлена плыве за далягляді
Я іду.
Цалуе ногі босыя
Травамі сасмяглымі зямля.

З воблака-кудзелі цягне нітку
Рэактыўны — ўвішны павучок.
Ластаўкі снуюць над полем нізка,
Быццам сесці хочуць на плячо.

Ад каго ж я прычакаю ласкі,
Як не ад зямлі, такой сваёй?
І таму здаецца дзіўнай краскай
Лебяда ля сцежкі палявой.
*1974*

* * *

Душа чалавека, нібыта рака,—
Імклівая плынь і устойлівы бераг.
Яе дабраты і любові не змерыш,
Душа чалавека, нібыта рака.

Калі абмялее аднойчы рака,
То ёй чалавек — дапамога спрадвеку.
А хто дапаможа душы чалавека,
Калі абмялее яна, як рака?
*1974*

* * *

Жыццё шуміць, як гай зялёны.
Пражыты дзень — апаў лісток.
Ідзе ад каранёў да кроны
Трывогі восеньскае ток.

І чалавек, нібыта дрова,
Жыццёвы снасцігае рух.
Мудрэе ён ці не мудрэе —
Наплыў на сэрца новы круг.
*1974*

* * *

Якія ночы дорыць жнівень!
Сакочуць конікі ў траве.
Качыны вывадак імкліва
Дарожкай месяца плыве.

А зоркі вышай падняліся,
Буйнее золкая раса
На цёплым,
як далоні,
лісці,
На непагасных верасах.

Ласкава шэпча ў вуха вецер,
Сасна шуміць пад галавой
Аб тым, што я у гэтым свеце
Жаданы самы, самы свой.

І добра мне ісці сцяжынкай
Ці каляінай палявой,
Крывінкай кожнаю і жылкай
Зліваццa з роднаю зямлёй.
*1974*

* * *

Запамінаю кожны дзень,
Якім ён ёсць, запамінаю —
І сонца над зялёным гаем,
І пад старою вішняй цень,

І спевы жаўранка ўгары,
І пах духмяны колкай пожні,
Нібыта гэты дзень апошні,
Апошні на календары.

Прашу яго: ты не мінай,
Яшчэ такім ці будзе новы...
І чую —
          нехта шэпча словы:
— Запамінай, запамінай...
*1974*

## У ХВІЛІНУ ВЯРТАННЯ СНЯГОЎ

У хвіліну вяртання снягоў
Пазіраюць у неба лясы і азёры,
А над імі сняжыны, як ціхія зоры,
Робяць безліч малых і вялікіх кругоў.

У хвіліну вяртання снягоў
На маўклівай зямлі,
                    як ніколі, трывожна.
Прадчуваючы хуткі палон, асцярожна
Рэчка мацае хваляй цяпло берагоў.

У хвіліну вяртання снягоў
Вецер сціх,
          на грудах акалелых распяты,
І кляны заінела пасталі ля хаты
Дрэўкамі без палотнішчаў
                    зыркіх сцягоў.

У хвіліну вяртання снягоў
Неўміручым так хочацца
                    быць чалавеку.
Толькі ведаю я,
          што бясконцага веку
Не спытаць, не купіць
                    ні ў людзей,

ні ў багоў.

У мяне неаплочаных многа даўгоў,
Ды дарма бедаваць,
сумаваць аб пражытым.
У сэрцы шчодрыя мары
ўзыходзяць, як жыта,
У хвіліну вяртання снягоў.
*1974*

* * *

Я жорсткасці зазнаў урокі,
Ды больш вучылі дабратой.
І каб, здаецца, не сурочыць,—
Жыў і жыву навукай той.
Без боязі адкрыты вочы
У свет, што вулеем гудзе.
Лічу я: жорсткасць — гэта ночы,
А дабрата — высокі дзень.
Хоць цяжка іх паважыць, змерыць,
Кажу з адзнакай праваты —
Я ў сілу жорсткасці не веру,
Я веру ў сілу дабраты.
*1974*

## ВЯСЛО

Ты помніш?
                Ноччу чорнай,
Як месяц не свяціў,
Крадком — у дзедаў човен
І наўпрасткі у ціш.

Нас туманы хавалі,
І вецер быў нам брат.
А човен неслі хвалі
Да берага, у сад.

Там яблык самы спелы,
Стаіўшы мройна дых,
Нібы Адам і Ева,
Дзялілі на дваіх.

Світання спеў празрысты,
Ты ў ім цвіла, жыла...
Мы прыплылі на прыстань,
Ды толькі без весла.

А дзед злуе уранні: —
Бач, чэрці, не да сноў...
І у цяньку старанна
Вясло габлюе зноў...

Ты помніш? Ноччу чорнай
Іду я за сяло...
У дзеда новы човен
І новае вясло.
*1975*

* * *

З абрыву сцежка кінецца —
Крутая.
Рабіна жарам дыхае з гары.
І каляндар увішны
год гартае,
Яшчэ лісток і сталасць на двары.

Пасланы па зіму,
Бы ў нейкай змове,
Над паплавамі трубяць жураравы.
Іірыйшла пара вучыцца простай мове
Лясоў і птушак,
Ветру і травы.
*1975*

## ЗВОН ЧАСУ

Бег часу не адчуць у мітусні,
У зладжанай зададзенасці быту...
А ты струну імгнення закрані,
Нібы смычком,
сваёй душой адкрытай.

І ты пачуеш
не пяшчотны спеў,
А часу звон,
трывогу запытання:
«Ну, чалавек, пажыў,
а ці паспеў
Зрабіць што-небудзь?
Хутка ж развітанне!»

Гудзе абсяг —
і неба,
і зямля...
Жыцце на стрэлках ходзікаў
распята...
І тое,
што адклаў ты на пасля,
Звон часу
не пакіне
без адплаты.

Ты кажаш, што здзіўлю вас адкрыццём,
Пажыць яшчэ мне дайце,
як звычайна...
А над Сусветам,
над тваім быццём
Звон часу б'е
няўмольна і адчайна.
*1975*

## ПРЫЛЯЦІ, СІНІЦА ЎДАЧЫ

Неба цэлы тыдзень плача,
Мне таксама не спяваць.
Прыляці, сініца ўдачы,
Сум на смак пакаштаваць.

Дзень — высокая званіца,
Верху ў хмарах не відаць.
Дзе ж ты, птушка-чараўніца,—
Не магу я адгадаць.

Запрашаю не на дачу,
Не скакаць, не баляваць...
Прыляці, сініца ўдачы,
Сум на смак пакаштаваць.
*1975*

**ВЯЗЫНКА**

Каб словам акрыяць,
душой параіцца
З высокай праўдай,
праз гады жывой,
Прыходзім мы сюды
нясмелай раніцай
І сцішанай вячэрняю парой.

Сюды,
дзе развінае крылы бусел
І ахінае імі
свой куток,
Дзе молада
пад сэрцам Беларусі
Дум песняра
струменіцца выток.

Яго імя
не вырваць з нашых сэрцаў
Ні часу,
ні нягодам,
ні бядзе.
Паэта слова
вечна на паверцы,
Яно наперад наш народ вядзе.

Вітанне сонцу,
што між хмар вяслуе,
Гаям,
траве,
падлётку-жаўруку...
Зямля Купалы,
я цябе цалую,
Як матчыну шурпатую руку.
*1975*

* * *

Песні блукаюць між белых ствалоў —
Светла
        і зконка
                на Беларусі...
Сцюдзёны бярозавік вечных слоў
П'ю і ніяк не нап'юся.
1975

**КАМБАЙНЕР**

З лесвічкі на дол саскочыў спрытна,
Дужы,
        бы адчэсаны з камля,
І пад хлопцам у нязнаным рытме
Палубай хістаецца зямля.

Потам перамоклая кашуля
Скінута з плячэй,
                нібы цяжар.
Каласы
                да рук ласкава туляцца,
Вецер
                халадком лагодзіць твар.

Задаволены гарачай зменай,
Крочыць нетаропка ён у двор...
Спіцца соладка
                на свежым сене,
Неба сыпле
            зерне спелых зор.
Заўтра зноў не будзе у адгуле,
Рэха ад матора загудзе...
Мые маці сынаву кашулю
У нагрэтай сонейкам вадзе.
*1975*

* * *

Свабодна і лёгка ліюцца ў душу
Мядовыя пахі лугоў і дубровы...
З маленства
пад сэрцам цябе я нашу.
Зямлі маёй сціплай гаючае слова.
Не прагну ніякіх ласункаў, шчадрот,
Выгод камунальнага раю...
Айчыны б паветра ўзахлёб,
на ўвесь рот,
І матчынай мовы акраец.
*1976*

**ЛІСТАПАД**

Цёплы вецер нясе павуцінне над полем,
Асядае яно мне на скроні крадком...
Ад кляновага зарыва ясна ў ваколлі,
І душа захлынулася ціхім святлом.

Час спакойных развяг,
міг зямное спагады
Перад тым,
як закружыцца вір залаты.
Ты прыходзіш знянацку,
пара лістапада,
Каб адчуў смак
гаркавай тваёй праваты.

Вось яшчэ круг адзін
абышоў сарцавіну,
Лёг адбіткам мінулых надзей і трывог.
Чалавекам жыву
і аддзячыць павінен
Сонцу,
небу,
зямлі
я за ўсё,
што збярог.
Не чырвонцы збіраў,

а світальныя росы,
Квецень майскіх садоў,
плёскат хваляў рачных,
Салаўінага спеву сярэбраны россып,—
Хопіць скарбу майго да наступнай вясны!

Цёплы вецер нясе павуцінне над полем,
Асядае яно мне на скроні крадком...
Ад кляновага зарыва
ясна ў ваколлі,
І душа запалонена
ціхім святлом.
*1976*

**НАШ ВЕК**

*Пімену Панчанку*

Наш век сур'ёзны і актыўны,
Не любіць ён пустых забаў.
Ды ўсё ж між гуляў рэактыўных П
ачую раптам
звон цымбал.

Хоць і сіпяць вужакай шыны,
Гудзе наўсцяж асфальт шашы,—
Ласкава спеюць успаміны
У сэрцы,
нібы спарышы.

То рык зубрынай Белавежы
Світальным халадком дыхне,
То поле,
што не мае межаў,
У вочы васільком зірне.

Запаланяе родным,
блізкім
Душу,
пакрытую лядком.
І песня, чутая з калыскі,

З грудзей памкнецца ў свет цішком.
І часу я свайму наверу,
Даводзіць буду
зноў і зноў,
Што ёсць у ім
жаданы неруш
Пачуццяў шчырых,
добрых слоў.
*1977*

* * *

Спрадвечны круг жыцця і смерці
Ніхто
нічым не разамкне...
Сэнс гэтых слоў
спрабую змерацць —
І аж мурашкі
па спіне.

Мая трывога не за тое,
Што больш не буду існаваць,—
Нашчадкаў
зерне залатое
Дасць колас,
стане красаваць.

Адным хвалююся даўно ўжо,
Адчай мой грукае часцей:
Чый лік
я на зямлі памножу —
Гаспадароў або гасцей?

Я ведаю,
спазнаўшы поўна
Цану і радасці,
і бед,

Мне не ўсё роўна,
не ўсё роўна,
Якім пакіну белы свет.

Я крэўнасцю намёртва звязан
З усім,
што будзе,
ёсць,
было.
І мой галоўны абавязак
Рабіць дабро
і нішчыць зло.

З мяне спытаецца за веру,
З якой душа вяршыла рух,
За дапамогу чалавеку
Прайсці сумлення вечны круг.

Таму суровы я да песні,
Здаецца зноў,
што ўсё не так.
Мне з песняй
трэба уваскрэснуць
І над самім сабой
паўстаць...
*1977*

**СПЯВАЕ ЖЫТА**

*Максіму Танку*

І сонцу,
і ветру адкрыта
Палёў беларускіх душа.
Спявае высокае жыта,
Калыша знаёмы бальшак.

Падхоплены
песеннай плынню,
Ля ўзмежка,
нібы матылёк,
На тонкай дрыготкай сцяблінe
Плыве трапяткі васілёк.

Б'е спёкай,
Як ласкай, у грудзі.
Гарну да шчакі каласы,
І чуюцца ў сонечным гудзе
Мне продкаў жывых галасы:

«Нідзе ты не знойдзеш спакою,
Бо сэрца пакліча сюды.
І толькі
з бацькоўскай зямлёю

Ты будзеш заўжды малады».

Той песняй,
для кожнага новай,
Як хваляй,
мяне ахіне...
Айчыны жытнёвае слова Звініць у густой збажыне.
*1977*

**РЭЧКА ДЗІВА**

Зямля, што нарадзіла,
Заўжды шчадрэй на сонца...
Паруе рэчка Дзіва,
Як малако ў даёнцы.

Што дзіўнага, здаецца,
У ёй, змяцелай, вузкай?..
З маім зліося сэрцам
Яе жывое вусце.

І мне так пільна трэба
Пасля шляхоў далёкіх
Над вірам стаць, што ў неба
Глядзіць глыбокім вокам...

Зялёны дзень вяслуе,
Сплываюць аблачыны...
Я не ваду цалую,
А светлы твар Айчыны.

Гары нязгаснай свечкай,
Бярозка каля дому...
Маёй любові рэчку
Не перайсці нікому.

## САЛАЎІНАЯ СТАЛІЦА

*Бацьку*

Прарэджаныя шчыльным змрокам
У хатах гасяцца агні...
І толькі зоркі дзесь далёка
Міргаюць сонна ўвышыні.

Не зважыўшы на золь
і стому,
Дзе нацянькі,
а дзе бачком,
Аўтобус коціцца знаёмым
Вясковым
дрогкім бальшаком.

Так і жыцця калдобы трэслі,
І я ў будзённым тлуме спраў,
Як мокнуць пад даждамі стрэхі,
Не надта часта ўснамінаў.

Цяпер гляджу,
маўчу.
Не спіцца,
Хоць у аўтобусе спакой...
Маленства роснага сталіца
Махнула белаю рукой.

І ў гэту хвілю,
як ляшчына,
Што грэе ліст на бальшаку,
Адчуў і я,
мая Айчына,
Сваёй шчакой
тваю шчаку.

Усё бліжэй бярозка-вёска,
Якая ў кожнага — адна...
Там салаўіны цёхкат,
лёскат
Лунае ў лозах давідна.
Там вольны вецер,
ясны месяц
Над возерам,
дзе спяць чаўны...
Прыходзіць час.
Мы разумеем —
Без іх
няма ў душы вясны...

Я з тропу не павінен збіцца,
Іду з любоўю ў белы свет,
Бо салаўіная сталіца
Рукою мне махае ўслед.

## ДЗЕСЯЦІКЛАСНІЦЫ

Пад кронамі купчастымі
Ляжыць ружовы снег...
Сцяжынкай пакручастаю
Прабег раптоўна смех.

Ідуць дзесяцікласніцы
З апошняга званка,
Лагодзіць твары ласкаю
Духмянасць свежака.

Мяцеліцы пялёсткавай
Шчымлівы халадок
Прымае ў сэрца з лёгкасцю
Семнаццаты гадок.

Ён верыць —
                  хутка спраўдзіцца
Надзей усіх прагноз
З нязначнаю папраўкаю
На час і ўласны лёс.

Іх хвалю запаветную
Страмчэй,
        жыццё,
            ўзнімай!
Шуміць зялёным ветразем
Над светам добры май.

На незнаёмым беразе
Прыстануць іх чаўны...
Зямля ў сукенцы беленькай
Бяжыць на выпускны.
*1977*

**НАРОДНЫ ВЫРАЗ**

Вясковы дзядзька —
гумарыст і дока.
Цыгаркай зацягнуўшыся як след,
Любіў казаць, прыжмурваючы вока:
«А дурню дык і грамата ва ўрэд!»

Цудоўны выраз,
роджаны ў народзе,
Прыходзіць мне на думку акурат,
Калі гляджу, што ў нашым агародзе
Завёўся аглабельшчык, бюракрат.

А побач з імі нырнікам нязводным
У новы дзень шкрабуцца неўпрыкмет —
Двурушнік, падхалім, паклёпнік подлы,
Псеўдавучоны, проста прайдзісвет.

Бярэш у рукі іхнія анкеты,
Даешся дзіву —
кожны, як анёл.
Ёсць адукацыя яшчэ пры гэтым,
А калі так, то крэсла ёсць і стол.

Чытаў лісткі, пра дзядзьку зноў падумаў —
Бо: «Золата — не тое, што блішчыць...»
Яшчэ графой: разумны або дурань?
Хацелася б анкету надтачыць...

Вось бачу нос уздзёрты ганарыста,
А ў галаве — зацвілая вада...
Успамінаю дзядзьку-гумарыста...
Няма такой графы,
а як шкада!

*1977*

* * *

Не сказалі таварышу добрага слова,
Пры жыцці не сказалі,
як трэба было...
А цяпер назіраем,
схіліўшы галовы,
На самотны той груд,
што сняжком замяло.
Як яшчэ зашчыміць,
забаліць неаднойчы
Гэта слова ў душы схаладнелай,
калі
Ты прахопішся раптам
трывожнаю ноччу
З адчуваннем —
застаўся адзін на зямлі.
Так няпроста
даходзім да простай высновы —
Не шкадуй дабрыні,
што б з табой ні было...
Не сказалі таварышу добрага слова,
А яно б развінула
надзеі крыло.

## СВОЛЬНА
Балада

У гады Вялікай Айчыннай вайны 2118 дзяцей з вёсак Верхнядзвінскага раёна былі ўтоплены фашыстамі ў рэчцы Свольна.

Між цёплых траў,
і лёгка, і сваволька,
Рассунуўшы накаты берагоў,
Вілася
трапяткая рэчка Свольна
Блакітнай стужкай
у касе лугоў.

Стаяў над ёй,
зямнога шчасця поўны,
Ды раптам думка надышла сама: —
Чаму тут
у такі спякотны поўдзень
Ніводнае жывой душы няма?
Хіснула чараду лілеяў белых,
І глуха хваляй мовіла рака:
— Прыходзяць на рамонкавы мой бераг,
Нібыта да магільнага грудка.
Я пракляла той дзень,
калі фашысты

Кідалі ў вір бяздонны немаўлят,
Маліла сонца:
«Высушы дачыста
І не вяртай пасля
вады назад!»
Але яно свяціла так спакойна,
А я глыбела ад дзіцячых слёз...
І з той пары
стаў ранай незагойнай
І лютай карай
мой гаротны лёс.
Я слухаў моўчкі,
курчыўся ў адчаі,
Нібы бяроста курчыцца ў агні...
Здалося —
з-над вады яны крычалі,
Малілі
вочы дзіўнай чысціні...
А як жа мне цяпер,
рачулка Свольна?!
Іх вачаняты кожнай ноччу сню...
І зноў страшэнны вір мяне
павольна,
Але зацята
цягне ў глыбіню.
*1977*

* * *

Зарыпіць
сініх зорак у небе жарства —
Гэта вечнасць ідзе Мчечным Шляхам...
І хоць кружыцца ад вышыні галава,
Ды няма месца
суму і страху.
Нібы матчыны рукі,
знаёмым цяплом
Па шчацэ гладзяць спелыя травы,
Ахінае вей-ветрык празрыстым крылом,
Шэпча родныя словы ласкава.
Трэба верыць сабе,
слухаць сэрцам зямлю,
Снасцігаць дабраты таямніцы...
Лёс аб шчасці інакшым даўно не малю.
Тут яго зачарпну я з крыніцы.
Покуль век
нітку часу
маўкліва прадзе,
Абрываць не збіраецца ў скрусе,
І смяецца,
і плачацца так,
як нідзе,
У далонях маёй Беларусі.
*1977*

* * *

Наўзбоч асфальту ля кювета,
Дзе жвір пусты,
сівы пясок,
Узняўся промнем ціха-светлым
Жытнёвы дробны каласок.

За ўзлескам пыльным,
за ракою —
Палі,
што вокам не абняць.
Звініць там дружнай талакою
Уся ягоная радня.

А тут
з-пад шын шалёны вецер
Кулём злятае над адхон.
Без спадзявання,
што прыкмецяць,
Ён за паклонам б'е паклон.

Яму няўтульна і тужліва,
За зерне страшна:
быць ці не?
Ды ўсё ж глядзіць на свет шчаслівы,
Свой лёс ніколі не кляне.

Наўзбоч гарачага асфальту,
Дзе жвір пусты,
сівы нясок,
Пяе адзін,
але без фальшу,
Жыццю падзяку
каласок.
*1978*

## СЛЯДЫ

След шырокай і цвёрдай хады,
Паабапал —
слядочкі,
слядочкі...
Гэта я
іду праз гады,
Па рамонку у руках —
мае дочкі.
Травы леглі пад ногі ім,
У блакіце —
бусліны лёскат.
Вецер лашчыць дыханнем сваім
Валасоў трапяткія пялёсткі.

Шчодры свет
хараством закружыў,
Абнадзеіў
і шчасцем,
і згодай.
Чым,
жыццё,
я ў цябе заслужыў
Нечаканую ўзнагароду?..
І тады,
калі лёс прывядзе
Да апошняй трывожнай кручы,
Хлыне ў вочы святлом
іхні дзень,
Я адчую цяпло
кволых ручак.
Бачу —
там,
дзе знікаюць гады,
Што без жалю спяшаліся ўпрочкі,
Прападаюць мае сляды...
Застаюцца
Алёны слядочкі.
Зарастаюць мае сляды...
Застаюцца
Святланы слядочкі.
*1979*

## ПАКУЛЬ ЖЫВЕ МАЯ БЯРОЗА

Пакуль жыве мая бяроза,—
Бунтуе полымя ў крыві
І не збіваюцца на прозу
Святой любові салаўі.

Наскрозь
          жыцця густую крону
Пранізвае іх звонкі свіст.
На дол спалохана-здзіўлёна
Ляціць яшчэ зялёны ліст.

Я сам — мурожная палянка,
Дзе,
     чыста ўмыўшыся расой,
Стаіць бяляначка-славянка
З шаўковай русаю касой.

Душа, асветленая промнем
Яе глыбіннае красы,
Не стоміцца заўсёдна помніць,
Адкуль пайшоў
                    і чый я сын.
На пуцявіне чалавечай
Зямны
          прымаю ўдзячна лёс.

Не вечны мы
                    пад Шляхам Млечным,
Ды вечнае
                    святло бяроз.

Яно ліецца апантана
Над скрыжаваннямі трывог,
Каб і наступнік наш нязнаны
Яго ў сабе навек збярог.

Жыві, бяроза!..
                    Светлым болем,
Шчымлівай радасцю звіні...
На гэтым свеце
                    нас з табою
Адны
      трымаюць карані.

*1979*

## ПЛАЧ УНАЧЫ

Плач уначы...
Ці не вецер над ліпамі?..

Горка дачка над коўдрай усхліпвае.
Цельца малой да сябе прыгарну
І захлібнуся,
як ветрам над кручаю.
Крыж — на бяссонніцу,
бомбы,
вайну!..
Мой паратунак —
белыя ручанькі.
Шыю яны абвілі, як вязьмом,
Што ніякою бядой не парушыцца.
Стукаюць сэрцы — надзей метраном,
Хвілі ў маўклівую вечнасць цярушацца.
Спі, перапёлка...
Пакінь іх мне —
Думкі, што кулачкамі таўхаюцца...
Нешта часцей плачуць дзеці
У сне,
Нешта радзей дзеці ў сне
Усміхаюцца.
*1980*

## УШАЦКІЯ УЗГОРКІ

З калыскі верыў я сваёй зямлі,
Што нарадзіўся
пад шчаслівай зоркай,—
Не надта шчодрыя на хлеб палі,
Затое для душы —
лясы, узгоркі.
На ўзлобак вечнага груда ляціш,
Цалуеш сцежку босымі нагамі.
І раптам — слепіць шыр,
гайдае ціш.
І поўніць радасць вочы
з берагамі.
Глядзіш удалячынь да скону дня,
Дапытлівасцю кроў звініць,
пульсуе.
Маленькім сэрцам,
нібы птушаня,
З вялікім светам адчуваеш сувязь.
Быць пільным,
чуйным да чужой бяды
Высокая зямля мяне вучыла.
Таму мае няспешныя сляды
Не зарастаюць на пакатых схілах.
Хоць бачыў горы
ў дзіўнай старане.

А сняцца ўзгоркі -
стрэхі Беларусі.
Яны ўзялі даўно ў палон мяне,
І я з яго на волю не ірвуся.
Сюды ўзыду —
І тлуму скіну груз,
І захлібнуся родных вёсак дымам...
Ушацкія узгоркі —
не Эльбрус,
А як ідаць мне з іх
уся Радзіма!
*1981*

**МАМІНА ХУСТКА**

Пахне яна асцярожнай вясною,
Талых снягоў развітальным разлівам,
Цёплай пупышкай,
лісцін навіною,
Шчэбетам птушак, бязладным, шчаслівым.
Пахне яна клапатлівай снякотай,
Песняй пчалы,
сырадоем духмяным,
Спрэчкай спрадвечнаю бульбы з асотам
І мурагом,
што ў сяннік напіханы.
Пахне яна залатой павуцінкай,
Хрумсткай антонаўкай,
роснаю пожняй,
Ржэўнікам шэрым,
счарнелым naцiннем,
Голасам выраю ў небе трывожным.
Пахне яна маладзенькім марозам,
Дранікам, што на патэльні пячэцца.
Пахне яна нечым родным і розным,
Як прытулюся — аж зойдзецца сэрца.
Мы вырастаем марудна і хутка...
Пахне маленствам маміна хустка.
*1981*

## БЯРОЗАВЫ ГАЙ

Прыцягненне красы і святла
Чалавека да скону пільнуе.
Сцежка зноў да бяроз прывяла —
Прывітаць чысціню незямную.
Звонкі ўзлёт
санцавітых стваЛоў,
Лёгкі кужаль
смяшлівай лістоты...
Ты ідзеш
і душою без слоў
Просіш лёс незгаворлівы ўпотай,
Каб заўжды прад вачыма плылі,
Хвалявалі спрадвечнай мілосцю
Завушніцы на тонкім галлі
І радзімкі на белай бяросце.
*1981*

## БОТЫ

Памяць — паромшчык упарты —
З даўніх вязе берагоў
Віцьку — суседа па парце,
Большага брата яго.

Бацька іх лёг пад Варшавай...
Потым — што год, то няўрод...
Ім памагала дзяржава,
Ўсё, што магла,
для сірот.

Маці заплакала ўпотай,
Гоман на печы аціх —
Завуч прынёе дзецям боты,
Покуль — адны на дваіх.

Крочылі ў школу на золку
Сцежкай, дзе тлелі снягі,
Першы ў абноўцы кірзовай
І без абутку — другі.

Збочвалі разам да соснаў,
Там паравала зямля.
Брат падстаўляў ногі сонцу,
Мокрай спіной да камля.

Добра,
        што весняя ласка
Стала цяплець дзень пры дні.
Нібы гусіныя лапкі,
Ступні гарэлі на пні.

Віцька ж усё гэта бачыў...
Хоць разувацца шкада,
Боты на змену
                  без плачу
Брату спяшаўся аддаць.

Час быў такі...
Без звароту
Сплыў ён пад звон сініх крыг...
Зноў мне прысніліся боты,
Тыя —
        адны на дваіх.
*1981*

**ДЫМОК МАРШАНСКАЙ МАХОРКІ**

*Памяці Аляксея Пысіна*

На горкім,
            глухім рубяжы,
За рысай,
            для ўсіх немінучай,
Паэт незваротна ляжыць,
Абняты дняпроўскаю кручай.

Хмурынка ў яе на плячы,
Як выдых апошняй зацяжкі.
Зямля прыгарбела,
                        маўчыць.
Пад каменем шэрым і цяжкім.

Нічога з сабою не ўзяў,
А свет нам дабрэйшы пакінуў.
Забраў толькі жах пераправ
І холад акопнае гліны.

Ён гэтулькі ў сэрцы насіў,
Якое сначыну не мела.
Якое за ўсё і за ўсіх
Шчымела,
            балела,
                    смылела!..

Рабочых,
натруджаных рук
Завязаны вузел навечна.
Замкнуўся жыцця першы круг,
Другі — прадаўжаецца ў вершах.

Ён там — між акопных сяброў,
А слова выходзіць на сувязь,
На скроні планеты
Дняпро
Блакітнаю венай пульсуе.

Зноў хмары на свет папаўзлі...
Плыве
дым маршанскай махоркі...
Гарнуся да роднай зямлі,
Нібы да яго гімнасцёркі.
*1981*

* * *

Нашы мары
бясконцы сусвет абышлі,
Заўтра спраўдзіцца ўсё,
немагчымае сёння.
Прагу руху бярэ чалавек ад Зямлі,
Што без страху ляціць
у касмічным прадонні.
Ты, надзея,
жыві...
І настане той дзень,
І душа да душы невядомай
памкнецца,
Толькі хочацца верыць,
што памяць людзей
Не сплыве ў небыццё,
назаўжды застанецца.
У наступніка будзе
свой час і свой хлеб,
І трывога інакшая
сэрца апаліць...
Ды патрэбна яму,
каб сумленнем не слеп,
Нібы воку сляза,
ачышчальная памяць.
*1981*

**ЖЫЦЦЮ Я ЎДЗЯЧНЫ**

Жыццю я ўдзячны, што на вечным свяце,
Дзе лёс крыху пабыць дазволіў мне,
Ёсць і сляза, і цёплы смех дзіцяці,
І зорка недасяжная ў акне.
Спялее ўпарта розум разам з намі,
Ён вынесе людзей у іншы свет.
А я ў зямлю ўрастаю каранямі,
Тут мой —
            світальны
                        і апошні
                                    след.
Сярод глабальных думак і ўзрушэнняў
Хвалюе сціплай радасці аблог —
Прылёт шпака і парастка з'яўленне,
Дрэў з небам таямнічы дыялог.
Я не стаміўся вугалёк надзеі
З душы сваёй,
            як з вогнішча,
                                    вымаць,
Што чалавецтву і ягонай дзеі
Пачатак быў, але канца няма.
Ляці,
      Зямля,
            у вечнасць
                        зернем спелым,
Сумленнем,
            дабрынёю прарастай...
А што шукаў,
                  знайшоў я
                              ў свеце белым,
Мяне пра гэта потым распытай.
*1981*

* * *

Мне сніцца мора.
Там, за валам,
Што белапенна лёг да ног,
Ты, нечаканая, паўстала,
Над галавою — рук вянок.

Трымцела радаснае цела,
Крывінкай кожнаю жыло,
Нібы ў сябе ўвабраць хацела
Усё — да кропелькі — святло.

Яно звінела, і спявала,
І цалавалася з вадой.
І свет прыціхлы хвалявала
Сваёй загадкай маладой.

І не забудзецца ніколі,
І не паўторыцца нідзе ж...
Як промень трапяткі, паволі
Ты па каменьчыках ідзеш.
*1981*

* * *

Ад ласкі сонечнай стамлёная,
Цяжкая ад зямных шчадрот,
Галінка з вішнямі чырвонымі
Перахілілася праз плот.
Дождж сыпануў, ліпнёвы, цёплы,
Гарачы пыл з лістоты змыў,
І пасяліўся ў кожнай кроплі
Вялікі свет.
А з ім — і мы.
Гарэлі ягады спакусныя
Пудлівым полымем пакут...
Як я сачыў за тымі вуснамі,
Што цалавалі спелы цуд!
Зямля плыла...
Куды?
        Не ведаю...
Гайдаўся неба вечны звон —
То гуў вясельнаю бяседаю,
То закалыхваў, нібы сон...
А лёс — сваёй,
                        чужою воляю —
Вузлом завязваўся такім,
Што і цяпер расцяць не здолееш,
Хоць мучайся над ім вякі.
Ды мне

за часу перагонамі
Так лёгка ў сэрцы берагчы
Галінку з вішнямі чырвонымі
На сарамяжлівым плячы.
*1981*

* * *

*Лілі*

Там, дзе сырая зямля,
як турма,
Там, дзе нікога,
нічога няма,
Раптам мне выснішся промнем.
...Лета ці восснь,
вясна ці зіма —
Кожнай крывінкаю помню!
*1981*

* * *

Стажок жыцця ўсё вершыцца,
Штогод — чарговы ўкос.
І памяццю
і вершамі,
Здаецца, зноў падрос.

Стажок не надта зграбны ўжо,
А правіць не прашу...
Бо не прычэшаш граблямі
Ніяк маю душу.

Не там, дзе ціш празрыстая.
На зломнай паласе
Стаіць стажок расхрыстаны,
Ды ветрам не знясе.
*1981*

**ВЯЗЬМО**

Адвечнай роднасці вязьмо
Сціскае сэрца аж да болю.
Зямля прыслала мне пісьмо —
Зы шыбай жоўты ліст сваволіць.
Праз пальцы тонкія галін
Яшчэ нябёс лагода свеціць,
А ліст заетаўся ўжо адзін,
Яго вось-вось падхопіць вецер.
Халодны голас празвініць
Над полем, што плыве ў самоту,
І кінецца ў пусты зеніт
На ўсхліпе найапошняй ноты.
І мне ў свой час зляцець лістом
Туды,
адкуль няма звароту.
Зямля людзей —
мой вечны дом,
З табой — цяпер,
з табою — потым.
Абрыс гадоў ясней,
ясней.
І гавару я сам з сабою:
«Сціскай мяне,
сціскай мацней,
Вязьмо надзеі і любові...»

Стук радасны ў грудзях не змоўк,
Жыццё
        і плача.
                і смяецца...
Шчымлівай роднасці вязьмо
Услед за сэрцам разарвецца.
*1981*

## ТРЫ АБЛІЧЧЫ

Калі вочы мае праясніла заранка
І жыцця расхінуўся абрус,
Над калыскай
                спявалі тады калыханку —
Маці,
        каліна
                ды Беларусь.

Недзе зараз у сцішанай хаце
Пра мяне журбоцішча маці,

Засыпае маю пуцявіну
Белым цветам надзеі каліна.
І куды б ні пайшоў — застаюся
Пад бусліным крылом Беларусі.

Вочы выбліснуць ціхім сузор'ем
                у згадцы,
І трывогі абрынецца груз... Тры абліччы...
Ім вечна за нас хваляваца...
Маці,
        каліна
                ды Беларусь.
*1982*

## ГЛЫБІНКА

Дарога бітая ўрастае
Трыпутнікам і муравой,
Але яна яшчэ вяртае
Да вёскі дальняй, ды жывой.

Быў час, калі над пыльнай вулкай
Звінелі песні дацямна.
І адгалосак скокаў гулкі
Па ўсёй ваколіцы лунаў.

А зараз тут спакой світае...
Над шапкамі паніклых стрэх
Такая цішыня густая —
Гукні, дык хрусне, як арэх.

Але ж не вёска вінавата,
Што ўпрочкі адышлі сыны,
А іх бацькі ў сцішэлых хатах
Свой век агорваюць адны.

Каго прымусіш жыць прынукай?
У вёскі добрая рука,
Чакае гарадскіх унукаў
З паўнюткай квартай малака.

І, можа,
Пад нагою босай
Зямлі адчуўшы цеплыню,
Дзяўчо,
хлапчук рыжавалосы
З павагай глянуць на радню.

А потым, ідучы за дзедам,
Што завіхаецца з касой,
Ім давядзецца раптам зведаць
Свет з незнаёмаю красой.

Жыццё ідзе...
У ім магчымы
Нязвыклы паварот падзей.
Вунь мальвы яснымі вачыма
Глядзяць з прысад у новы дзень.

Глыбінка заетаецца з намі,
Не ўзяты сэрцы на замок.
Яшчэ курыць над камінамі
Надзеі вусцішны дымок.

*1982*

## НЯМІГА

Мячоў булатных скрыгат,
А мо скрыгочуць краны?
Цякла рака Няміга
Па камянях гадоў.
Цягнула ў вір Няміга
Ардынцаў зброд паганы,
Славян гаіла раны.
І вось... Няма слядоў.
Але жывуць крыніцы,
Яны як дух народны,
Якому не спыніцца,
Не высахнуць да дна.
І трэба пакланіцца
Зямлі адзінай, роднай,
Бо вераю нязводнай
Сілкуе нас яна.
У трох народаў кніга —
Радкі зіхцяць, як промні.
Не выцекла Няміга
Ні з сэрцаў, ні з вачэй.
Была рака Няміга —
Мы гэта ціха помнім.
Пакуль мы гэта помнім,
Яна яшчэ цячэ...
*1982*

* * *

Пад ліпай, што галлём чарнее,
Стаяла хата ў тры акны.
Жыла там цётка Паланея,
Адна як перст пасля вайны.

Сваёй не адрачэшся долі —
У хаце мужыка няма.
Сама ў гародчыку і ў полі
І на падворку ўсё — сама.

Калі салома ўшчэнт сатлела,
То выгляд даху сумным быў:
Дзе толь, дзе лацік бляхі белай,
А побач — гонта і гарбыль.

Цікаўны з бальшака зварочваў
Да хаты сцежкаю глухой,
Бо надта ж западала ў вочы
Яна стракатаю страхой.

А цётка шчыра рада госцю
І хваліць сціплае жытло:
— А што з тае мне прыгажосці?..
Абы за карак не цякло.

Увішнай, маладой хадою
У склеп спяшае па траве.
Нясе гарлачык сырадою:
— Частуйся, добры чалавек...

Над могілкамі дзень сінее,
Як васілёк маёй віны.
Пад крыжам цётка Паланея
Сніць вечна хату ў тры акны.

Свет не заўважыў гэтай страты,
Не азірнуўся на бягу...
А перад кім я вінаваты,
Што памяць,
як страху,
залатаць,
Відаць, ніколі не змагу?
*1982*

**СЛУХАЮ НАЧНУЮ ЦІШЫНЮ**

Слухаю начную цішыню,
Слухаю,
не палячы агню,
На абрыве над маёй Ушачай,
Што плыве праз тоўшчу зім і лет
Ніткай сувязі ў нямы Сусвет.
Слухаю...
Душа трывогай плача.

Слухаю начную цішыню...
Ліст падставіў росам даланю.
Вось яшчэ адна упала кропля.
Лашчыцца нябачны мне туман,
Ахінае мякка, як падман.
Можа, кропля заўтра стане кропкай?

Слухаю начную цішыню...
Я паверу маладому дню,
Толькі трэба дзеля вечнай мэты
Нам,
зямлянам,
разам ратаваць,
Ад гнілога бруду адмываць
І нядзеліць радасцю
планету.

Слухаю, як цішыня звініць,
Да лясной рачулкі,
да крыніц
Роднасцю нясцерпнаю прыкуты...

Спачывай,
сумленны чалавек,
Спачувай назаўтра,
з веку ў век
Стомленым,
галодным
і разутым...
Толькі не маім начным пакутам.
*1982*

**ЖОРНЫ**

*Алесю Жуку*

Зярністыя шэрыя жорны
Вычэсваў мой дзед з валуна.
Раптоўна вачам стала зорна
І змокла ад поту спіна.

Ён сеў. Сціхлі гулкія гукі,
Што мерна дзяўблі цішыню.
Цяжкія дрыготкія рукі
Натрэслі шчапоць тытуню.

Дымок адлятаў ціхім сумам,
Свяцілася шчэццю шчака.
Сялянскія вечныя думы
Цяклі, як з-пад жорнаў мука.

Вайной здратаванае поле...
Няўрод — ліхалецця працяг...
З нішчымніцай венчана доля,
А лёс шле нявестцы дзіця.

Павольна за думкамі следам
Маленства яго прыплыло.
Ды зараз і сам ён не ведаў —
Было гэта ці не было.

Упаў у траву недакурак,
Ля каменя сцішыўся дзед,
Зліліся ў адно — дзень хаўтураў
І дзень уваходзін у свет.

Навечна прапах хлебам чорным
Зямнога жыцця гонкі круг…
Зярністыя шэрыя жорны
Ніколі не спыняць свой рух.
*1982*

**ЗОРКА СМУТКУ ЗЯМНОГА**

Мабыць, шчасця замнога
Мне жыццё
напачатку дарыла.
Зорку смутку зямнога
Рана ў сэрцы яно запаліла.
Зорка смутку зямнога,
Ты ўзышла,
як святая адплата
За бяздумнасць былога,
За ўсіх тых,
перад кім вінаваты.

Ля аснежанай скроні
Час ляціць
у нястрымным разгуле.
Апякаюць далоні
І сляза,
і маршчыны матулі.
Поле,
рэчка,
азёры,
Хараством выцалоўваюць вочы,
Сосны з небам гавораць,—
Як да іх,
дарагіх,

мне не збочыць.
Дождж маркотны цярусіць
Ці вясна прымярае абновы —
Мне з крыніц Беларусі
Светла піць
незабытыя словы.
Крочу вуліцай шумнай
Ці блукаю ушацкім пагостам —
Западае ў душу мне
Гэты свет,
кожнай рысай няпросты.
Зорка смутку зямнога
То паблякне,
то зноў разгарыцца...
А праз вечнасць дарога
Мкне бясконца,
пыліцца,
імгліцца.
*1982*

* * *

Ён быў дзівак.
Яшчэ малым гадзінамі
Мог разглядаць травіну, мураша.
Памкненнямі няўлоўнымі
і дзіўнымі
Жыла душа.

Сталеў,
Дужэў дапытлівасці крыламі,
Сябе над светам не збаяўся ўзняць.
Яму стагоддзяў далячынь адкрылася,
Іх глыбіня.

Ён Млечным Шляхам вандраваў
у будучым,
А потым супыняў свой лёгкі крок
І ў прыску зор рассыпчатую бульбачку
Паціху пёк.

З ім хораша было дзяліцца пошапкам
Пра самае святое
І маўчаць.
Для сябра ён адзежыну апошнюю
Мог зняць з пляча.

Калі пісаў, не ведаў стомы, голаду,
На снег мог выйсці з дому басанож.
Каб праўду бараніць,
З рукамі голымі
Пайшоў на нож...

Глядзяць нябёсы вінавата, спуджана
На той грудок, які ўмясціў Сусвет.
Яго нікому замяніць не суджана —
Ён быў паэт.
*1982*

* * *

*Памяці Рыгора Семашкевіча*

Далёка было да адлёту, да восені,
Зялёнае лета цвіло на зямлі.
А дзікія гусі на Свірскае возера
Упалі, тужліва крычаць пачалі.

Над вечным грудом
іхні крык сёння носіцца,
І паліць падзол ціхай зоркі сляза.
Ні ў кога адказу душа не дапросіцца:
«А што ж ён хацеў,
ды не змог мне сказаць?»
Трывога
будзённым жыццём не прытуплена,
Туманіцца дзень за ільдзінкамі шкла.
Балюча вачам углядацца ў наступнае,
Як быццам паменела ў свеце святла.
*1982*

* * *

Харошыя людзі нядоўга жывуць...
Іх сэрцы згасаюць, а думы плывуць,
Маўкліва плывуць пуцявінай сваёй,
Зліваюцца з зорамі, сонцам, зямлёй.
Здаецца, што мора касмічнай імжы
За нас без супынку трывогай дрыжыць.
А ўдзень промні спела і густа звіняць,
Спяшаюць цяплом, дабрынёю абняць.
І коласа жменя зярнят залатых
Прыносіць сялянскую веру ад іх...
Ды ўсё ж з вамі свет
і радней
і бліжэй,
Харошыя людзі,
жывіце даўжэй!
*1982*

## СЦЕЖКА АД СТУДНІ

Як чарацінка крохкая,
Плывеш і не прыстанеш.
— Нядоўга ж так,—
дзед вохкае,—
Пераламіцца ў стане.

Смех у адказ пасыплецца,
Старэча хмыкне ў вусы.
А вецер пад касынкаю
Сваволіць з пасмай русай.

У вёдрах сонца плавае,
Спякотна слепіць вочы.
Таму, напэўна, жвава я
З тваёй дарогі збочваў...

І сцежка тая помніцца,
І смеласці даволі...
Больш чарацінка з поўным мне
Не стрэнецца ніколі.
*1982*

* * *

Спачатку — ты,
а потым — я —
Такая прымаўка твая.
Каханая,
даруй за тое,
Што горкіх слоў
нясеш ты крыж.
Што часам крыўды
ў сэрцы тоіш,
Маўчыш,
пакутуеш,
не спіш.
За непрынесеныя кветкі,
І занядбаны хатні гуж,
Як і за тое,
што ў суседкі
Надзвычай дамавіты муж.
За тое,
што не годзіш модзе,
Што ў іншых больш убораў ё'сць,
Што, як дажджы,
як снег,
праходзяць
Твае краса і маладосць.
Зрэдчас падумаецца жартам
Так,
я — і грэшнік і святы,
Ды ўсё ж,
калі чагосьці варты,
То вінавата ў гэтым — ты.
Спачатку — ты,
а потым — я...
А прымаўка ў цябе — мая!
*1982*

* * *

Каго люблю, таму на вочы
Стараюся трапляць радзей,
Каб нечым дробным не сурочыць
Пачуцці блізкіх мне людзей.

Сабе не знойдзеш долі лепшай,
Чым ведаць — ёсць сябры мае:
Хто ладзіць зруб,
хто спеліць вершы,
Хто чарку на радзінах п'е.

Адна прысутнасць іх у свеце,
Дзе многа крыўд,
сляпога зла,
На ўсё жыццё спагадай свеціць,
Мне цёпла ад таго святла.

І словам простым я шчаслівы,
Хоць бы такім:
«Ну, як жыў-дуж?»
Бо веру ў мудрую маўклівасць
Паразумення родных душ.
*1982*

**ЧАРНАВІК**

На маім чарнавіку
Света свет малюе.
На маленькую руку
З зайздрасцю гляджу я.
Тупаюць паміж радкоў
Жвава чалавечкі,
Сонца ёсць, сям'я грыбоў,
Стужка сіняй рэчкі.
З вуснаў зліжа язычок
Потым кроплі поту.
І галоўка набачок —
Ацаніць работу.
Стома сцішыла дачку,
Бег рукі таропкай...

Як на тым чарнавіку
Мне паставіць кропку?
*1982*

## КАЛЯ ПЛЯЧА КАЛОЖЫ ДУМНАЙ

*Валянціну Блакіту*

Яшчэ я неаднойчы ўспомню
Той дзень,
нястрымны бег ракі.
Сплывалі крыгі ўніз па Нёмне,
Нібы купальскія вянкі.
Каля пляча Каложы думнай,
Што пільнавала вечны рух,
Было і нам
зусім не сумна
На беразе
стаяць удвух.
Чаму нязвыклым круглым крыгам
Мы доўга
пазіралі ўслед?
Трывожыў сэрцы не адлігай,
А крэўнасцю глыбокай свет.
І неба
дыхала спакоем,
І смехам
цешыла дзятва,
А спела пачуццё такое —
Не выказаць і не стрываць,
Бо снегавы абшар айчыны
Нам душы прасвятліў
да дна.
Яе зрачыся немагчыма...
Жыццё адно, зямля адна...
Іду ў той дзень,
нібы па промню,
Ці будзе дзень яшчэ такі?..
Сплываюць крыгі ўніз па Нёмне,
Нібы купальскія вянкі.
*1982*

* * *

За гарою знік лужок маленства,
За пагоркам — маладосці гай.
Сцежка полем сталасці пралегла,
А далей сінее небакрай.
Веру, што мой дзень яшчэ высокі,
Умалотны зернем спраў і дум.
Самыя прыгожыя аблокі
Зносяць, нібы крыгі, ціхі сум.
Лепшай мне не трэба ўзнагароды.
Ёсць жыццё.
Я на любой вярсце
Пакланюся мудрасці прыроды
І яе суровай праваце.
Век жыві — і век спялі адвагу,
Сыдуцца усё ж,
　　　　　　што ні кажы,
Непазбыўнасць
　　　　　　вечнага працягу,
Непазбежнасць
　　　　　　страшнае мяжы.
Не натоліш смагу існавання,
Не ўратуе нават лішні год.
Паўстаюць світанні,
　　　　　　　　як пытанні,
Ды адказ не высвеціць заход.

Час мой,
Набірай крутую хуткасць
І не грэбуй падзяліць са мной
Чорны каравай
　　　　　　　　зямнога смутку,
Белы бохан
　　　　　радасці зямной.
*1982*

* * *

Дзень і жыццё,
Ёсць у іх падабенства.
Раніца звонкая,
нібы маленства,
Поўдзень гарачы і дужы,
як сталасць,
Вечар задумлівы, ціхі,
як старасць.
Сонца світальнае
срэбнагалоса
Грае і пераліваецца ў росах.
Сонца ў зеніце
нястомнае ў працы,
Сілы надоўга хапае старацца.
Сонца вячэрняе
моўчкі знікае,
Не папярэджвае і не чякае...
*1982*

* * *

Мы сцежкай дзён сваіх
Зайшлі ў жыццё далёка,
Але шукае слых,
Але пільнуе вока
Скрозь дождж,
імжу
і снег
Світальны дар вытокаў:
Маленетва росны смех,
Адкрыцці першых Крокаў.
Вунь хата ўскрай сяла
Раскрыла аканіцы,
І мама падышла
З вядзерцам да крыніцы.
Ты б кінуўся туды,
Каб сцішыцца ў паклоне,
Піапіць жывой вады
З прасвечаных далоняў.
Ды тыя дні сплылі
За далягляд,
як востраў.
Спрадвеку на зямлі
Жыць і любіць няпроста.
На нлечы цісне час,
Бязлітасны, трывожны.

Ён не шкадуе нас,
У ім згарае кожны.
Сцякае лісця медзь
У плынь настылых водаў...
І трэба зразумець,
Што гэта — назаўсёды.
*1983*

**НАЧНАЯ РАЗМОВА**

Ціхі шэпт каля вокан —
бярозе не спіцца
Пад халодным мігценнем
пранізлівых зор.
Я выходжу на двор.
— Ты прабач мне, сястрыца,
Што запозна адчуў негняўлівы дакор.
Хутка лісце тваё
панясе вольны вецер,
Незаўважана новая восень прыйшла.
Як ніколі,
цяпер
у няўстойлівым свеце
Надта хочацца ўсім
дабрыні і цяпла.
Праз цябе,
праз мяне
мкнуць шчымлівыя токі
Вечнай крэўнасці з нашай калыскай —
зямлёй.
Месца хопіць жывому
пад небам высокім,
Хоць у кожнага шлях —
і агульны,
і свой...

Напінаюцца думы трывожна,
як струны,
І няма ім супыну,
няма ім канца...
А планета ляціць і трымае кірунак
На сузор'е Стральца,
на сузор'е Стральца...
*1984*

**НЕДАСЯЖНАЯ ЗОРКА**

Жывеш, як і кожны жыве,—
Работа, сустрэчы, гаворка...
Ды ўсномніш, што недзе плыве
Твая недасяжная зорка.
Яна асвятляе гады
Без скідкі на слабасць, без жалю,
Хоць ясна пакінуць сляды
Не суджана ўсім на скрыжалях.
І ўсё ж чалавек свой сакрэт
Шукае, надзеяй сагрэты,
І зноўку ўрываецца ў свет
На крылах нязвыклае мэты.
Нягледзячы на мітусню,
На быт, да якога прыкуты,
Насустрач высокаму дню
Рваніся і ты праз пакуты.
Не думай, што блізка зямля,
Што можна ўзляцець і разбіцца.
Смялейшыя прыйдуць пасля,
Ты ім дапамог нарадзіцца.
Калі на ўсе грудзі глынеш
Той мудрасці простай і горкай,
Кранешся і ты, не мінеш
Сваёй недасяжнае зоркі.
*1984*

**ДОБРАЕ СЛОВА**

Гэтай ісціне веру даўно,
І яна для мяне як замова:
У людзей ёсць багацце адно —
Чалавечае, добрае слова.

Слова злое заўсёды было
Для варожасці першаасновай.
Свет
скрозь цемру дзікунства
вяло
Да святла
толькі добрае слова.

Каб праменьчык жыцця не патух,
Душы
веснім дажджом
адмывала,
Чалавека абуджаны дух
На такія вышыні ўзнімала!

Горы золата і серабра —
Ад бяды ненадзейная схова.
І прыходзіць такая пара,
Што захочацца добрага слова.

Хлеба кошт не адзін:
то спаўна,
То над крошкай трасуцца галовы...
Не мяняецца толькі цана
Гэткай дробязі — добрага слова.
*1984*

**СУТНАСЦЬ**

*Аляксею Дудараву*

Прыходзім для чаго мы ў гэты свет,
Што тут пакінуць назаўжды павінны?
Пражыта многа,
ды які твой след?
А час бяжыць,
спяшаюцца хвіліны...
Пытаннямі такімі я даўно
І невылечна,
як відаць,
хварэю,
Хоць сонца шчодра свеціць у акно
І дзеці весела ў двары дурэюць.
Там,
паміж іхніх,
чую галасы
Маіх дачок — гарэз светлагаловых.
Далёка ім яшчэ да паласы,
Калі трывожна
сэрца спеліць словы.

Калі на вочы набяжыць сляза
Няпрошана,
здаецца, без прычыны,
І дум шчымлівых не пераказаць,
І ты глядзіш,
глядзіш у твар Айчыны.
Глядзіш у вочы пасівелых хат,
Дзе мудрасць продкаў
у хатуль сабрана,
Дзе па-старому,
як вякі назад,
Хлеб наразаюць стоячы,
з пашанай.
Глядзіш у нетры
дымных гарадоў,
Дзе ўзведзена на п'едэстал работа,
Дзе ў гулкай кузні
вогненных гадоў
Дух і метал
куюцца вечным потам.
Жылі і мы нялёгка на зямлі —
За слова
спаганяе час сурова.
Душой мяцежнай
праўду берaглі
І самае святое —
нашу мову.

Чакае ўсіх наступнага прысуд,
Але не збудаваць жыццё інакшай.
А што не так — няхай жа родны кут,

Як бацька,
пaўшчувае, ды прабачыць.
Сінічка ценькае,
блакіт дзяўбе,
Смяецца сонца, і гуляюць дзеці...
І нешта застаецца ад цябе
На гэтым
найдарожшым
белым свеце.
*1984*

* * *

Я не вымольваў слоў пяшчотных...
Як дождж да смяглае раллі,
Яны прыходзяць незваротна
На грэшнай і святой зямлі.
Іх нараджэння таямніца
Не падуладна адкрыццю.
Бруіць тваёй душы крыніца
Насустрач спешнаму жыццю.

І дзівіць дар яе мілосці
На свет выносіць дзень пры дні
Святло глыбіннай прыгажосці,
Пясчынкі ціхай дабрыні.
Жыццё свой круг імкліва вершыць,
Ды застаецца вечны шлях,
І шэпт, і пацалунак першы
На разгарачаных губах.

Твой спеўны голас не сціхае,
З'яднаў ён неба і зямлю.
Жыву,
пакутую,
кахаю
І праз цябе ўвесь свет люблю.
*1985*

## РЭХА МАЎЧАННЯ

Іскрыцца іржэўнікам поле,
Брыдуць лугавінай стагі.
Буслы над глухім наваколлем
Адчайныя робяць кругі.

Крылом разганяючы скруху,
Спрабуюць вярнуць добры дзень,
Ды ў зоне —
ні гуку, ні руху,
Упаў на зямлю змрочны цень...

Машыны ў калдобах гайдае,
І пыл, што падняўся з дарог,
На скроні журбой асядае
Усім, хто пакінуў парог.

Увішна праводзіць па колах
Дазіметрам юны салдат,
І доўжыцца шлях невясёлы
У свет ад дзядоўскіх прысад,

А я, захліснуты адзіным
Жаданнем, вярну з бальшака
Туды -
на малую радзіму
Вялікага палешука.

У цішы музейнай нямееш,
Здаецца, сядзіць за сталом
З рукою параненай Мележ,
Як птушка з падбітым крылом.

Сядзіць, вечнай думаю скуты,
Кругі пад вачмі паплылі.
Душу разрываюць пакуты,
Чужое маўчанне зямлі.

І ён не адкажа, што будзе,
Пытальна глыбее нагляд —
Ці вернуцца птушкі і людзі
Да гнёздаў спрадвечных назад?

Даносіцца з нетраў туманных
Праз даўкую чорную быль
Тужліва-адчайнае: «Га-а-н-н-о-о...»,
Пяшчотна-жывое: «Ва-сі-і-ль...»
*1986*

* * *

Адшчыраваў пчаліным звонам ліпень,
І жнівень вырай на крыло падняў...
Жыццё здаецца не такім вялікім,
Як у маленстве некалі ўяўляў.
Не ведаю:
ці доўгі,
ці кароткі
Застаўся мне прамежак для быцця,
Але хацеў бы адысці, як продкі,—
Спакойна, Лёгка,
З верай у працяг.
Жыцця ніколі не бывае многа,
Так як і праўды — колькі ні жыві.
І ёсць адна любоў,
Адна трывога:
Айчына —
ты і ў думах, і ў крыві.
Твой жытні хлеб,
Глыток гаючай мовы
І ў вечным сне
не страціць,
не забыць.
Мяне не будзе, застанецца слова,
Якім хачу заўжды цябе любіць.
Ніхто не абмінае смерці плаху,
Застынуць зоркі і ў маіх вачах...
А ты жыві,
Гадуй дзяцей без страху,
Цярпліва доўжы свой
праз вечнасць
шлях.
*1986*

**ПЕРАКУР**

Стары цясляр адкінуў трэску,
Паволі разагнуў спіну,
Цяжкой рукою звыкла, рэзка
Сякеру ў вугал удзяўбнуў.

Зірнуў на ціхія прысады,
На недакошаны лужок,
Дастаў бляшанку з самасадам,
«Раёнкі» адарваў шматок.

Свяцілася смалой бярвенне,
Вянцы — як поціск моцных рук.
Скакаў у зрубе ў нецярпенні,
Нібы шпачок, маленькі ўнук.

Стары ўсміхаўся: «Зараз, зараз...
Паспееш, жэўжык. Бач ты іх...»
А потым аж змяніўся з твару
І на паўслове раптам сціх.

Малы уходання не ведаў,
Давіўся горкімі слязьмі: «Чаго маўчыш?
Ты чуеш, дзеду? Хутчэй мяне к сабе вазьмі!»
А дзед сядзеў...
Сам ледзь не плакаў,
Глядзеў з журбой на хлапчука...
Растрэсла ўпершыню табаку
Яго дрыжачая рука.
*1986*

## **ВЕЧНАЯ ДАЛЕЧ**

*Генадзю Бураўкіну*

Далеч Беларусі ветравая
Панаўзбоч няспешных бальшакоў...
Зноў яна імкліва наплывае,
Ціснецца ў душу з усіх бакоў.

Хлеба,
Волі,
Памяці дыханне
На сваім крыле абсяг прынёс,
Каб не прападала адчуванне,
Што сатканы з іх навечна лёс.

Капне на запылены трыпутнік
Ціхая дажджынка ці сляза.
Што памкнуўся ўсіх часоў пакутнік.
Толькі аднаму табе сказаць?

Хто лісцінку ў жылках цёплых, белых —
Болю і любові стойкі сплаў —
Да душы зняможанай, знямелай,
Як далонь ласкавую, прыклаў?

Дня расце высокая званіца,
Растае ў нябёсах спакваля.
Нейкую святую таямніцу
Прыхавала родная зямля.

Ходзіць полем вецер асцярожны,
Звоніць жыта маладая медзь.
Хочацца на камень прыдарожны
Сесці і да забыцця — глядзець...
Глядзець...
*1986*

* * *

Гарацъ чырвоныя каліны,
Святло ўзыходзіць ад зямлі.
У небе крохкім, жураўліным
Журботна гукі паплылі.

Гучаць сярэбранын горны,
Лёт набірае гонкі клін.
Ён далячынь душы прасторнай
Рассёк на яву і ўспамін.

Спяшае кожны ў век дарослы
Сваёй наіўнасцю сляпы,
Пакуль не замільгаюць вёсны,
Як прыдарожнын слупы.

І прыйдзе раптам з ціхім болем
Зямная ісціна адна
Гады не вернуцца ніколі,
Хоць кліч іх з ранку да цямна.

Ды лёс няварта вінаваціць,
Што сірацее чарада,
Што волю не бярог, а траціў...
Тваё жыццё, твая бяда.
Гараць чырвоныя каліны,
Якім не раз яшчэ цвісці.
А мне пад небам жураўліным
У далеч вусцішна ісці.

То хваляю любові строгай,
То скразняком нямой тугі
Праз сэрца працячэ трывога
І злучыць долі берагі.
*1986*

**САЛОЎКІ**
Балада

Там, дзе вербы ля крыніцы,
Як зялёная падкоўка,
Адкрывала аканіцы
Ранку
        вёсачка Салоўкі.

Дацямна зямлю арала,
Ад хвароб збірала зёлкі,
На старэнькіх кроснах ткала
Дываны, нібы вясёлкі.

І звычайна вечарамі,
Што прапахлі мёдам, сенам,
Душы ўсе ў адну збірала
Песняй роднай, задуменнай.

Кожны госць
                людзей распытваў:
«Хто ж так хораша спявае?»
— Бабка Ганна,
                    дзед Мікіта...
Хата трэцяя ад краю...

Час ляцеў
                для ўсіх няпросты,
І не знойдзеш вінаватых,
Што не стала краю ў вёсцы.
Вёска стала
                                толькі хатай.

Сумна жыць,
                але патрэбна
Век адмераны адолець.
«Шумяць вербы каля грэблі...» —
Чула неба,
                                чула поле.

Свет,
      адданасцю сагрэты,
Сам рупліва колас песціў.
Ды прыйшло і тое лета —
У Салоўках змоўклі песні.

На бярвенні ля паркана
Мы сядзім...
                Красуе жыта.
«Заспявай,
                бабуля Ганна...»
А ў адказ:
            «Няма Мікіты...
Ён мяне —

кажу праўдзіва
У рукавх насіў,
як свечку.
Спадзявалася на дзіва
Будзе спевам цешыць вечна.
Хай не чуе боль сірочы
Свеце ясны,
свеце белы.
Як закрыла дзеду вочы,
І сама тады знямела...»
Я праз два гады наведаў
Кут,
які душу трывожыў.
Поле скрозь...
Няма і следу
Ад Саловак тых прыгожых.

Не вітаюць вербы госця
І не шчодрыцца крыніца...
Пад чаромхай на пагосце
Шэры груд
сырой зямліцы.
Галавою да галоўкі
Дзед з бабуляю вякуе...
Заліваюцца салоўкі,
Толькі іх ніхто не чуе.
*1987*

* * *

Не верыў я, што так бывае,
Ды міг той вечна сцерагчы.
Рука пяшчотная, жывая ,
Сцякла паволі на плячы.

Адкуль,
з якіх глыбінь сусвету
Яна,
як промень,
прыплыла
Халодным,
непрытульным летам
Да незнаёмага жытла?

Не расчыняла ўладна дзверы,
Цішком не стукала ў акно,
Ды ў тое змусіла паверыць,
У чым зняверыўся даўно.

Лічыў сябе вар'ятам потым,
Нармальныіы гэта
не сасніць...
А змог жа нечаканы дотык
Зямлю і неба замяніць.

Маланкай
згадка
скронь апаліць,
Адпусціць багна мітусні.
Зноў непрыручаная памяць
Цябе нясе з далечыні.

Ступой
пакорлівай і гордай
Па долі крочыш наўскасяк.
І перахоніць раптам горла,
Не пракаўтнуць сухі камяк.

Скажы,
якім багам маліцца
За гэта ціхае: «Дазволь
Мне,
хоць на хвілю,
прытуліцца
І падзяліць
твой сум і боль...»?
*1987*

* * *

Асенняя шчымлівая дарога,
І ты — неспадзяванкай незямной.
Я пра цябе не ведаю нічога...
Пабудзь са мной.

Пабудзь са мной...
Не я шапчу,
а лісце,
Што шаргаціць у сутані лясной.
Было вясёлым і яно калісьці...
Пабудзь са мной.

Якая далеч мгліцца за плячамі,
Якая высь над першай сівізной!
А мы ніколі гэтак не маўчалі...
Пабудзь са мной.

Ніштo мяне не ўсцешыць
і не здзівіць,
Ты будзеш самай лепшай навіной.
Вачэй тваіх адтайваюць ільдзінкі...
Пабудзь са мной.

Чым станем потым
мы ў вялікім свеце:

Зямлёй,
Травой
Ці зоркаю скразной?
Прамень надзеі
не згасае,
свеціць...
Пабудзь са мной,
Пабудзь са мной...
*1987*

* * *

Над вечным сном
то лістапад закружыць,
То вея снегам замяце зямлю...
Пакуль жыву —
душа шчыміць і тужыць,
Пакуль я ёсць —
і помню,
і люблю.

Падлёткамі кляліся ў маладосці
Быць разам,
пільнавацца чарады.
Чаму ж дачасна на нямым пагосце
Шарэюць сіратлівыя груды?

У ланцугу быцця слабеюць звенні
І выпадаюць не ад старасці.
За выбітым аж тройчы пакаленнем
Яшчэ прагал скразны начаў расці.

Хоць лёс стараўся ласкаю прывеціць,
Не выправіць яму чужой віны.
У вырай моўчкі адлятаюць дзеці
Вайны з народам
і святой вайны.

Сталёвым крокам
і мажорным спевам
Душу не супакоіць
гонкі час.
Не ведаю цяпер,
як без мяне вам,
Я добра ведаю,
як мне без вас.
І боль не выкажаш
гаротным сказам,
І век астатні
перабудзеш з тым:
Жыццё,
як свята,
адзначаем разам,
А паміраем — толькі па адным.
*1987*

* * *

Ніколі гэты свет не дакарай,
Хоць ён,
магчыма,
і пакрыўдзіў нечым.
Світанне цалавала неба край,
Шугае дзень,
а потым будзе вечар.
Апошнім промнем
стомлена
зара
Асветліць неўміручы твар прыроды,
І ты адчуеш,
што прыйшла пара
Развітвацца з усім
і назаўсёды...

Зязюля змоўкла...
На зыходзе час,
І немагчыма шлях пачаць нанова.
Развітвайся без помслівых абраз,
А толькі
ўдзячным позіркам
ці словам.
Развітвайся з птушынай чарадой,
З крыніцай,

што пад вербамі бруіцца,
З былою весялосцю
і з бядой,
Каб потым з імі непрыкметна зліцца.

Яшчэ адно,
што давядзецца тут
Адчуць у хвілю гэтага яднання,—
Нібы пясчынка,
груз жывых пакут
Прад тым цяжарам
вечнага маўчання.
*1987*

**ЛЕСАПАВАЛ**
Трыпціх

*Памяці паэта Сяргея Ракіты*
*(Сяргея Васільевіча Законнікава)*
*прысвячаю*

**І.МЕРА**
Падалі,
падалі сосны,
Стогнам будзілі тайгу.
З гулам франтоў громаносных
Перагукаўся той гул.

З камер — у хвойныя нетры
Рабства абрынуўся груз:
Мера пайка — кубаметры,
Мера жыцця — хлеба кус.

Гніллю смярдзючаю кормяць,
Самае страшнае — збой.
Сёння не выцягнуў нормы —
Заўтра не зробіш тым больш.

Крыўду
і горыч знямогі
Мусіш цярпець,
як салдат.

Шпал для ракаднай дарогі
Просіць яшчэ Сталінград.
Цёплае дрэва прыклада
Воіну грэе шчаку...
«Вораг народа»,
не падай
На грабавым сівярку...
Тут са сцяжыны не збочыш —
Кветкі,
як зрэнкі тугі,
Нібы вытайваюць вочы
З шэрых сумётаў тайгі.

Можа,
у дол пахавалі,
Можа,
сняжком замяло...
На чалавекапавале
Нормы тады не было.

**2. СТАНЦЫЯ СУХАБЯЗВОДНАЕ**

Бура няўмольная, неверагодная
Лісце мяце пад абрыў...
Сніцца мне станцыя Сухабязводнае,
Хоць там ніколі не быў.
Сухабязводнае...
Назву няўценшую
Ёй недарэмна далі.
Памяць імкнецца сюды
змрочнай сцежкаю
І з беларускай зямлі.
Сухабязводнае...
Вусны атручаны
Чорнай расой
мёртвых слёз,
Сэрцы калючым дротам абкручаны:
Гэта не што-небудзь — лёс.

Каты жартуюць:
«Паветра азоннае —
Як на курорце, дужэй!»
Толькі пад небам,
што вісне над зонаю,
Дыхаць цяжэй і цяжэй.
Побач — злачынцы і невінаватыя,
Але з гучнейшым кляймом.
Людзі,
знямогай і голадам сцятыя,
Спяць ліхаманкавым сном.

Вошы піруюць
пад вопраткай латанай,
Горла смурод пераеў...
Гора Айчыны

з уласнымі стратамі
Не перамешвае гнеў.
«Хочам на фронт...»,—
вусны ў сне варушыліся…
Пісьмы ляцелі...
Дарма.
Весткі ад Сталіна,
ад Варашылава
Сіл дачакацца няма.
Можа,
і сталі б іх грудзі сухотныя
Цвёрдым шчытом...
Не далі.
Кінуў адчай —
на пасты кулямётныя
Хлопцы над чэргі пайшлі.
Маладнякоўцаў
радкі бурапенныя
Не перакажа тайга.
Самі паэты,
іх слова сумленнае
Зніклі ў глыбокіх снягах.

Знік недзе тут
і Сярожа Законнікаў,
Толькі імя мае —
знак...

Колькі было іх —
лічы на сасонніку,
Вырас лясны маладняк.
Я там пабуду...
Сухабязводнае
Стала,
як плот,
на шляху.
Можа,
душу,
ад пакут несвабодную,
Роспач адпусціць крыху.
Жыцці людскія,
як лісце халоднае,
Ветрам змяло пад абрыў...
Сніцца мне станцыя Сухабязводнае,
Хоць там ніколі не быў.

**3. ПІСЬМО АДТУЛЬ**

Разгублены і вінаваты
Лёс-паштальён мяне спаткаў.
Хоць праз паўвека,
адрасату
Усё ж пісьмо ён перадаў.
Ад нас нічога ім не трэба...
І кожны зразумее сам
Радкі адтуль,

як пайка хлеба,
Што ў рукі перайшла сябрам.
Яе чакаў і ён:
штукарыў,
Спяваў, каб голад перабыць.
І вось на заінелых нарах
Адзін,
затулены,
ляжыць.

Хоць гэткай воляю шчаслівы,
Пазычыў ім —
жывым —
цяпла.
І як ніколі
справядлівай
Дзяльба той лустачкі была...
Няма збавення ад сумлення.
Мінулае,
пагамані
За тры маўклівых пакаленні,
За доўгія гады хлусні.

Да чорных дзён няма звароту,
Скідае страх з душы народ.
Ды колькі тых,
якія ўпотай
Яму заціснуць хочуць рот.

Прыгледзься.
Можа, не адразу,
Але заўважыць пільны зрок
Людзей,
што, нібы ад праказы,
Ад праўды вернуць нос убок.
І тых распазнаваць няцяжка,
Хто падаё,
як грошык свой,
Не пайку праўды,
а даважку,
Што трэскай змацавана з ёй.
То тут, то там — неснадзяванка,
Хоць і дарога ў нас адна...
З пісьмом адтуль
сяджу да ранку
Каля трывожнага акна.
Халодных зор
бруіць мігценне,
І месяца цямнее твар,
Нібы на ім блукаюць цені
Нікім не лічаных ахвяр.
Мой грэшны свет!
Жыві інačай,
Не зганьбі новую зару...

А я над пайкай праўды плачу,
З самім сабою гавару.
*1987*

**ЗАКЛІНАННЕ**
Трыпціх

*Памяці Уладзіміра Караткевіча.*

I

На Беларусі Бог жыве...
*У. Караткевіч*

Зара паціху,
каб людзі не чулі,
Збірае з неба
зоры ў прыпол...
У чыстай адпрасаванай кашулі
Сеў
Чалавек
за пісьмовы стол.
Як плуг,
стыло папаўзло асцярожна
За небакрай,
дзе буркоча гром.
Блішчаць адвалы,
глыбеюць барозны
Нашай долі
пад вечным пяром.
Па добрай волі,
па ўласнай ахвоце
Ён лёс
даўно
паставіў на кон.

Адзін толькі дух
пасабляе плоці
Катаржнай працы
трываць
прыгон.
Яго не супыніш — марная справа,
Ён не прымае ўгаворы,
дакор...
Паруе кубак
адчайнае кавы,
Зноў бікфордна
дыміць «Беламор».

Усё жыццё,
як святая малітва,
Сатканая з неадступных дум:
«Радзіму,
Мову,
што выжылі ў бітвах,
Родны мой Люд,
не аддай на глум!»

У мітусні
і ў чарнобыльскім гудзе
Нечаканых біблейскіх трывог
Яго заклінанне
пачуйце,
людзі...
І Беларусь не пакіне Бог.

II
І я перад ім
стаўся грэшным,
Бо меў столькі ласкі,
цяпла.
А як жа злаваў ён пацешна
У зрэнках
хітрынка жыла.
Гасціннасцю шчодрай, вясковай,
Прывеціць ён кожнага мог.
Стаіць у дзвярах.
Чую словы,
Як толькі ступлю праз парог:
«О, Божа,
ты «выкаеш» зноўку!
Дакуль можна лаяць,
вучыць?
Вазьмуся,
відаць,
за лупцоўку,
Ух, буду ж і здорава біць!
Чаму,
як шпачок жаўтадзюбы,
Смяешся ?

Не возьмеш на змор.
Кідай загаворваць мне зубы,
Не руш,
не бунтуй угавор.
Усё,
браце,
ясна і проста,
Нашто гарадзіць нам платы.
Паэты не маюць узросту,
І ўсе іх вялічаць на «ты»...»
Я ведаю — лаяцца будзе,
І мне не знасіць галавы...
Да Слова,
што край наш абудзіць,
Звяртаюся толькі на «Вы».

III
Прысяду цішком на карэнне,
Спіну прысланю да камля.
Аднекуль з глухіх сутарэнняў
Жыццём абзавецца зямля.
Даверліва вочы закрыю,
Харал забруіць у вушах.
Нібы на анёлавых крылах
Узносіцца лёгка душа.
А цела пацягнецца потым
Туды -
пад сівую кару.
Адчую ўтрапёнай істотай,
Што з дрэвам узняўся ўгару.
Адны ў нас бунтоўныя сокі,
Адны каля сэрца
кругі.
І вось я высока-высока —
Няхай пазайздросцяць багі!
Адгэтуль
душой
і вачыма
Па-новаму бачыцца свет...
Я помню,
з якое прычыны
Мне
Майстра
адкрыў
свой сакрэт.
**1989**

* * *

Дзе ўзяць той мёртвай і жывой вады,
Каб імі пакрапіць маю зямлю?
І мушу,
          як замову ад бяды,
Шаптаць адно-адзінае: «Люблю...»

*1990*

© OCR: Камунікат.org, 2011 год
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2011 год
© PDF: Камунікат.org, 2011 год

## БІЯГРАФІЧНАЯ ДАВЕДКА

Сяргей Іванавіч Законнікаў нарадзіўся 16 верасня 1946 года ў вёсцы Слабада Бешанковіцкага раёна Віцебскай вобласці. Пасля з бацькамі-настаўнікамі пераехаў на сталае месцажыхарства ў вёску Глыбачка Ушацкага раёна, дзе скончыў сярэднюю школу. У 1964-1969 гадах вучыўся на філалагічным факультэце Беларускага дзяржаўнага універсітэта, а ў час летніх канікул працаваў на будоўлях Беларусі і Казахстана.

Быў настаўнікам роднай мовы і літаратуры, карэспандэнтам раённай газеты, сакратаром райкома камсамола, працаваў у газетах «Чырвоная змена», «Звязда», у апараце ЦК КП Беларусі. З 1986 года — галоўны рэдактар часопіса «Полымя».

Першыя вершы надрукаваны ў 1963 годзе ў абласной газеце «Віцебскі рабочы». Аўтар паэтычных кніг — «Бяседа» (1973), «Устань да сонца» (1976), «Пакуль жыве мая бяроза» (1981), «Вера, надзея, любоў» (1983), «Прысак часу» (1986), «Вечная далеч», «Сутнасць» (1987), «Заклінанне» (1991). У перакладзе на рускую мову ў Маскве ў выдавецтве «Советский писатель» выйшла кніга паэзіі «Встань раньше

солнца» (1985). Выступае з публіцыстычнымі артыкуламі.

Вершы паэта перакладаліся на мовы народаў СССР, а таксама на нямецкую, іспанскую, балгарскую, польскую, сербскахарвацкую, в'етнамскую мовы.

Пораклаў па беларускую мову паасобныя творы паэтаў Расіі, Украіны, Грузіі.

Сяргей Законнікаў лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Аркадзя Куляшова, узнагароджаны ордэнам «Знак пашаны».

## ЗМЕСТ


Святая воля
«Зямля мая...»
У Брэсцкай крэпасці
«Сякуць жанчыны ў гародах капусту...»
Размова з цёзкам
Гуслі
Жыву на зямлі
Прыходзьце да мяне
Цішыня
«Дзесьці вучоныя расшчапляюць атам...»
Выспелае поле
Першаадкрыццё .
Алёнка
Куля. *Балада*
Купаю дачку
«Абуджан лес сабачым брэхам...»
Памяць
Роздум
Хлеб
Табе адной
«Дзень крыло распасцёр...»
Вечная радня
Душа лесу
«Увагай шчырай, пацалункамі...»
«Сонца над мядовымі пракосамі...» .
«Душа чалавека, нібыта рака...»
«Жыццё шуміць, як гай зялёны...»
«Якія ночы дорыць жнівень!..»
«Запамінаю кожны дзень...»
У хвіліну вяртання снягоў
«Я жорсткасці зазнаў урокі...»

Вясло
«З абрыву сцежка кінецца...»
Звон часу
Прыляці, сініца ўдачы
Вязынка
«Песні блукаюць між белых ствалоў...»
Камбайнер
«Свабодна і лёгка ліюцца ў душу...»
Лістапад
Наш век
«Спрадвечны круг жыцця і смерці...»
Спявае жыта
Рэчка Дзіва
Салаўіная сталіца
Дзесяцікласніцы
Народны выраз
«Не сказалі таварышу добрага слова...»
Свольна. *Балада*
«Зарыпіць сініх зорак у небе жарства...»
«Наўзбоч асфальту ля кювета...»
Сляды
Пакуль жыве мая бяроза
Плач уначы
Ушацкія ўзгоркі
Маміна хустка
Бярозавы гай
Боты
Дымок маршанскай махоркі
«Нашы мары бясконцы сусвет абышлі...»
Жыццю я ўдзячны
«Мне сніцца мора...»
«Ад ласкі сонечнай стамлёная...»
«Там, дзе сырая зямля, як турма...»
«Стажок жыцця ўсё вершыцца...»
Вязьмо
Тры аблічча
Глыбінка
Няміга
«Пад ліпай, што галлём чарнее...»
Слухаю начную цішыню
Жорны
Зорка смутку зямнога
«Ён быў дзівак...»
«Далёка было да адлёту, да восені...»
«Харошыя людзі нядоўга жывуць...»
Сцежка ад студні
«Спачатку — ты, а потым — я...»
«Каго люблю, таму на вочы...»
Чарнавік
Каля пляча Каложы думнай
«За гарою знік лужок маленства...»
«Дзень і жыццё...»
«Мы сцежкай дзён сваіх...»
Начная размова
Недасяжная зорка
Добрае слова
Сутнасць
«Я не вымольваў слоў пяшчотных...»
Рэха маўчання
«Адшчыраваў пчаліным звонам лінень...»
Перакур
Вечная далеч
«Гараць чырвоныя каліны...»
Салоўкі. *Балада*
«Не верыў я, што так бывае...»
«Асенняя шчымлівая дарога...»
«Над вечным сном...»
«Ніколі гэты свет не дакарай...»

Лесапавал. *Трыпціх*
Заклінанне. *Трыпціх*
«Дзе ўзяць той мёртвай і жывой вады...»
Біяграфічная даведка

Законнікаў С.
Святая воля: Выбр. лірыка. Мн: Маст. літ., 1993.- 174 с - (Б-ка беларус. паэзіі).
ISBN 5-340-01062-7.

Лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Аркадзя Куляшова (1982) Сяргей Законнікаў, які так шмат робіць дзеля нашага духоўнага нацыянальнага адраджэння, ужо сваімі першымі выступленнямі ў друку (1963) засведчыў свой непадробны грамадзянскі пафас, сваю шчырую любоў да роднае зямлі.

У гэтую кнігу ўвайшло лепшае з яго кніг «Бяседа», «Устань да сонца», «Пакуль жыве мая бяроза», «Вера, надзея, любоў» і інш.

© OCR: Камунікат.org, 2011 год
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2011 год
© PDF: Камунікат.org, 2011 год